# ВЫНІКІ ДЗЕЙНАСЦІ
# ПА ВЯРТАННЮ КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ І ІХ КОПІЙ
# ЗА 2024 ГОД

18 лютага 2025 года ў Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь адбылося выніковае пасяджэнне Камісіі па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны абарот культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. На ім былі падведзены вынікі дзейнасці Камісіі за 2024 год.

Пасяджэнне правялі сустаршыні Камісіі – намеснік Міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Амбразевіч Ю.Г. і намеснік Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Саракач С.А.

Саракач С.А. прадставіў вынікі дзейнасці арганізацый і ўстаноў, якія прымаюць удзел у вяртанні культурных каштоўнасцей беларускага паходжання.

Было адзначана, што ў 2024 годзе фонды дзяржаўных арганізацый культуры і архіўных устаноў папоўніліся на 504 адзінкі за кошт атрыманых Рэспублікай Беларусь арыгінальных прадметаў, а таксама электронных і лічбавых копій культурных каштоўнасцей беларускага паходжання.

У фонды Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» перададзены 15 твораў жывапісу і графікі мастака Міхаіла Канстанцінавіча Сеўрука.




З фатаграфіі вядомага слуцкага фатографа Саміра Львовіча Юхніна перададзены ў фонды Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.







Беларускім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў атрыманы ў падарунак ад расійскага рэжысёра Н.М.Майданскай і прыняты на захоўванне 186 адзінак захоўвання фотадакументаў перыяду 1970-х – 1980-х гг., якія адлюстроўваюць гісторыю беларускага кіно.

У выніку работы па выяўленню і камплектаванню дакументамі па гісторыі беларускай літаратуры і мастацтва, якія знаходзяцца на захоўванні ў архівах замежжа, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва атрымаў 219 лічбавых копій дакументаў з уласнага архіва польскага мовазнаўцы, славіста Фларыяна Няўважнага (Польшча), у тым ліку, перапіскі з Уладзімірам Караткевічам.




Рэспубліка Беларусь таксама атрымала:

11 выяў (у электронным выглядзе) прадметаў з гомельскай калекцыі князёў Паскевічаў. Копіі зроблены з гістарычных фотаздымкаў, на якіх адлюстраваны працэс перапахавання генерала-фельдмаршала І.Ф. Паскевіча і яго жонкі ў 1889 годдзе;





3 лічбавыя копіі музейных прадметаў  з калекцыі Наўгародскага дзяржаўнага аб’яднання музея-запаведніка (Расійская Федэрацыя), якія раней знаходзіліся ў зборах Беларускага  дзяржаўнага музея (1923-1944 гг.);

| | | |
|---|---|---|
| 1. |  | **Икона. Богоматерь Иверская**. XIX в.<br>Дерево, левкас, темпера, тиснение по левкасу.<br>142,5x101x3,5 см<br>НГМ КП 2911<br>ДРЖ-477<br>ГК 4188866 |
| 2. |  | **Неизвестный художник**. **Женский портрет**. XIX в.<br>Дерево, масло.<br>99x80 см<br>НГМ КП 7599<br>ГК 4190655 |
| 3. |  | **Икона. Свт. Митрофан Воронежский**. XIX в.<br>Дерево, левкас, темпера.<br>22x18 см<br>НГМ НВ 17996/132 |

1 копію лічбавай выявы твора невядомага мастака «Партрэт старухі» (першая палова XIX ст.) ад Федэральнай дзяржаўнай бюджэтнай установы культуры «Государственный музейно-выставочный центр «РОСИЗО»

(Расійская Федэрацыя, г. Масква); 11 адзінак уліку копій відэадакументаў і 40 адзінак уліку копій фотадакументаў прыняты Беларускім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў на пастаяннае захоўванне ад Цэнтральнага дзяржаўнага архіва кіна-фотадакументаў і гуказапісу Рэспублікі Казахстан;

| | | |
|---|---|---|
| 1. |  | Неизвестный художник<br>«Портрет старухи»<br>(первая половина XIX века, холст, масло, 63×47 см, КП-9959, инв. № АФЖ-370) |

1 электронную копію сюжета «30-годдзе Перамогі прысвячаецца. Людзі добрыя, памятайце...» з кіначасопісу «На Волге широкой» № 13 1975 г. Казанскай студыі кінахронікі передадзены дзяржаўнай установай «Дзяржаўны архіў Рэспублікі Татарстан», і прыняты на захоўванне Беларусім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў;

14 лічбавых фотакопій з “Фото-альбома разрушений, причинённых немецко-фашистскими оккупантами городу Вилейке”.

Па выніках пасяджэння быў зацверджаны план работы Камісіі на 2025 год.